БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Раіса Баравікова

Пад небам першага спаткання

Лірыка

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1990

ББК 84Бел7
Б24

Серыя заснавана ў 1967 г.

Раиса Боровикова — одна из самых ярких представительниц поэзии ее поколения. Безудержная страстность ее интимных стихов в последнее время сочетается с внутренней сдержанностью, не теряя при этом силы чувства и глубины понимания жизни.

В книге собрано лучшее из творческого багажа поэтессы, лауреата Литературной премии имени А. Кулешова.

ISBN 5-340-00623-9 (6)

* * *

Няхай гавораць людзі ля кіёскаў,
што я ў палопе песенных забаў,
што нада мной вясёлкавай палоскай
сусед-мастак нябёсы распісаў.

Сяброўкі абсталёўваюць кватэры,
я п'ю ў лясах на досвітку расу
і незалежна, з выглядам гетэры,
чыёсьці сэрца ў кошыку нясу.

1974

ІМГНЕННЕ

Усё адыходзіць, сплывае ў нябыт.
Мне час не стрымаць, не падоўжыць
імгненне.

Чырвоная іскра ляціць у блакіт,
знікае, адчуўшы адно сутыкненне
з паветранай хваляй...

З будзённасці шэрай, нібыта з туману,
расінкай празрыстай імкнуся
да сонца,—
а раптам я промень гарачы дастану
і зоркай заззяю хаця б на імгненне,
каб знікнуць, адчуўшы адно сутыкненне
з пяшчотай зямною.

1974

* * *

Мне сёння прыснілася хата...
У ёй мы калісьці жылі!
Вясною там бэзу багата,
звіняць над лугамі чмялі.
Праз сон я ў маленства глядзела,
ў туманны, сівы вербалоз,
я зноў святкавала нядзелю
ў зацішку знаёмых бяроз!
Шумелі за хатаю сосны,
і стукалі промні ў акно,
малою на ўзмежачак росны
спяшалася слаць палатно.
За вокнамі стукалі колы,
зарою палаў далягляд,
і плакала я, бо ніколі
туды не вярнуся назад.

1974

* * *

Сярод папер, сярод лістоў,
сярод маіх штодзённых сноў
тваё імя, твая рука,
узнёсласць лёгкага радка.

Бяру аловак і пішу,
жыццё былое варушу.
Як на экране — на сцяне
твой плашч нібыта бачу ў сне.

Там за акном маім — ліхтар,
адзіны сведка слёз і мар!
Ці ж я прызнаюся яму —
пісаць ужо няма каму.

1974

ФАРБЫ

Усцяж дарогі чорныя крыжы,
усцяж дарогі белыя рамонкі.
Пунсовыя адценні на шашы,
то ціхі шэпт, то водгукі гамонкі.
Раптоўны крык...
        Пунсовага няма!
Прырода нікне, гіне фарбаў безліч,
але вядуць чырвонага каня
для чалавека, што ступае безвач.
Стаю, гляджу ўтрапёна на шашы,
на месцы слупянею, зрок губляю...
Чаму, чаму мне белыя крыжы
ўсё чорныя рамонкі ў твар
        шпурляюць!

1974

* * *

Будзе яблык салодкі і спелы,
залаты будзе восеньскі звон.
Вось тады я у казачна-белым
устрывожу ваш ранішні сон.

Працягну я гарачыя рукі,
вас пяшчотай нязвыклай крану
Так, напэўна, дзівосныя гукі
абарваную лашчаць струну.

1974

СВІТАННЕ Ў ПАРКУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Галінка трапяткая ўпала,
як недапісаны радок.
Сад вераснёвы і Купала,
лісця зжаўцелага грудок.

І ля фантана, што за сцежкай,
таксама восеньскі агонь,
русалка пырсне там не ўсмешкай,
а плачам тоненькім на скронь.

Забаваў летніх шчабятуха,
як многа слёз яшчэ пральe!
Паблізу незнаёма глуха
аб камень Свіслач хваляй б'е.

І я прыцішваю дыханне...
Там, дзе лісця ляжыць грудок,
Купала шэпча на світапні
свой недапісаны радок.

1978

ЗІМОВЫ ЭЦЮД

Зіма мінаецца, чаму ж
на сэрцы боязна-трывожна,
па белым снезе асцярожна
бяжыш ад холаду і сцюж?
Пачую хутка капяжы...
А мне мілей за ўсё сумёты,
і ціша ранішняй дрымоты,
і лёгкі смутак на душы.
Нібы падбелены садок...
Зірні ў акно і схамяніся,
капрызна просіць: «Пасміхніся!»
там сына тоненькі слядок.
Зляціць усмешка, і крылом
заб'ецца ў шыбу птушка сонна.
Як непаўторна і будзённа
зямля глядзіцца пад ільдом.
Пагляд да строгасці прывык,
і завывае вецер глуха...
А ты душу сваю паслухай,
там пра вясну пяе кулік.

1978

ЗАБРОДДЗЕ

* * *

Забродскі шлях.
Нябёсаў просінь.
На ўзгорак выбегла адчайна.
Мне дзень прыдаўся
незвычайным,
хоць ведала, што хутка восень.

Трава пажухлая хрумсцела,
а я вышуквала прычыны,
чаму ў акне няма мужчыны,
якога бачыць я хацела?

Над вёскай жураўлі кружылі,
быў сум прытоены ў прыродзе,
каму з нас кветкі варажылі:
прыйшла пара забыць Заброддзе.

Я не хацела чуць пра гэта,
узгорак з лёгкасцю мінала.
Яшчэ жыла спякотай лета,
а можа, толькі ўспамінала.

* * *

Я сёння не прысела да стала.
Усё яшчэ жыву ў тваім палоне.
Я не ў радок,
          я ў намяць узяла
ласкавае цяпло тваёй далоні.

Пакутліва-трывожна б'ецца ў скронь
бяссонніцы суровы пепарадак,
мяне праз ноч
          вядзе твая далонь
ад ласкі да бяздоказных здагадак.

Кахання растрывожаны агонь...
Лягчэй сцярпець удар каванай
          праэжкай,
мяне праз дзень
          вядзе твая далонь,
у ноч вядзе,
          дзе нават дыхаць цяжка.

Дык будзь жа блаславёны за палон!
Скаруся бездакорна волі лесу.
Начэй забродскіх ярасны агонь
кране ўспамінам голле вербалозу.

ЛЯ ЧЫГУНАЧНАГА ПЕРАЕЗДА

Ах, як лёгка ляцелі лыжы!
Быў загадкавым пошум хвой.
Нечы шалік пушысты і рыжы
прыняла на імгненне за твой.

Трапяталі спалохана вейкі,
хоць здаваўся раўнюткім адхон,
за якім прабягалі рэйкі
невядомай тузе наўздагон.

І з прыродаю снежнаю ў згодзе,
ледзь стрымаўшы кароткі уздых,
я ўявіла на момант Заброддзе
сярод схілаў таемна крутых.

1978

ВЕРЛІБР, НАПІСАНЫ ПАД РАНІЦУ

Алавяны салдацік з андэрсенаўскай
казкі,
налі я спакойна спала вясповаю зорнай
ноччу,
нечспадзявана раптоўпа стаў выбіваць
чачотку,
і столік пад ім хістаўся, як палуба
карабля.
Ён то смяяўся, то плакаў, той прыгажун
аднаногі,
рукамі хапаў паветра і некага клікаў
тужліва,
і прачыналіся людзі, прачнуўся вялікі
горад,
і месяц над ім гайдаўся, як на арэлях
хлапчо.
І падалі, падалі зоры, ноч перастала быць
ноччу,
распаўся пакой, як атам у вопыце П'ера
Кюры,
а я ляжала спакойна ў ложку сваім
вясновым
і зразумела раптам, што ты — мой
каханы...

1978

РУСАЛЧЫНА КВЕТКА

Яшчэ няма яе, бялюткай...
Ёсць толькі завязі штуршок.
А ўжо ляжыць на хвалі хуткай
пялёсткаў тоненькі штрышок.

І калі з'явіцца гарлачык,
дальбог, пабачу я здалёк —
над ім з русалкаю ў мячык
гуляе лёгкі матылёк.

1978

АПОШНЯЯ СУСТРЭЧА

Азвуцца хутка снегапады.
Пра іх ужо гамоняць ветры.
А мы з табой зіме не рады
у гэты вечар непрыветны.

У час апошняе сустрэчы
засланы вочы ціхім жалем,
пакутліва накрыла плечы
я пры табе пуховым шалем.

Глядзіш адчужана, зласліва —
я для цябе ужо чужая!
На санках снежаньскіх імкліва
да нас расстанне пад'язджае.

Адводжу позірк свой маўкліва
і час зацягваю упарта!
З табою не была шчаслівай,
а без цябе і жыць не варта!

Лягла на твар разлукі боязь,
ды пагляджу ніякавата...
І пакланюся нізка ў пояс,
нібыта ў нечым вінавата.

1978

ВОСЕНЬСКІ САД

Прытушыць дождж агеньчык пачуцця,
у небе жораў крыкам адзавецца,
а я спытаю,— як табе жывецца,
ці вычакаў ты долю ад жыцця?

Калыша вецер гэты ціхі сад,
паслухай толькі, музыка якая,
я не яе, каханы мой, чакала,
я думала, ты вернешся назад.

Калі ж аднойчы з'явішся сюды,
што адшукаеш тут, сярод лістоты,
ды не шукай цяпла маёй пяшчоты
там, дзе жалобы восеньскай сляды.

1978

* * *

Стракатасць выставачнай залы
і лесвічны пралёт круты.
Там незнарок табе сказала
нязвыклае да здзіву: «Ты».

Калі суніме вечар спёку,
аблашчыць прыцемак кусты,
як лёгка вымаўляць здалёку
знаёмае да болю: «Ты».

А ноччу чуць, як чысцяць пёркі
стрыжы пад сховай цемнаты...
Не спаць, варочацца і горка
шаптаць да рання зноўку: «Ты».

Выходзіць з дому, кутаць плечы,
збіваць расу з густой травы,
чакаць нязначнае сустрэчы,
каб вымавіць шматзначна: «Вы».

1978

* * *

Зіма, зіма, сыпні калючым снегам
на сон маўклівых ледзяных галін.
Рассыпся па палях з'інельым смехам,
азораная светласцю хвілін
тых самых першых, ясных на дасвецці
у эпіцэнтры смутку і глушы...
Мне цяжка зразумець, чаму на свеце
так мала адзіноты для душы.

1978

* * *

Выпадкова машыну спыніла...
І зірнула туды з-пад рукі,
дзе фіранка пад колер чарніла,
нібы вершаў маіх радкі.
Пад нагамі патрэсквае гравій,
поўня сцеле сцяжынку-бель...
Так, напэўна,
          ў чужую гавань
заплывае чужы карабель.
Так, напэўна, сыходзіць на прыстань
з трапа знуджаны морам марак,
ды святло за фіранкай празрыстай,
як падманна прызыўны маяк...

Пад акном Вашым ясень танюткі
будзе поўню гайдаць у лісці,
і блакітныя кветкі анюткі
будуць сумам маім цвісці.
Будзе ясень спяваць калыханку
белай поўні пра бераг чужы,
аж пакуль не ўстрывожаць фіранку
гаманою сваёю стрыжы.
Вы адкрыйце яе,аднавесце! —
Нібы з мора ўплыве халадок,
і пранізлівы — Вашай нявесце —
карабля развітальны гудок!
Непатрэбна чужая мне прыстань
Не прымаю яе аніяк!
За світальнаю даллю агністай
мне міргае інакшы маяк.
Там, далёка, таксама танюткі
будзе ясень ля хаты расці,
і зямлі беларускай анюткі
будуць Вамі штолета цвісці.

1978

* * *

З-за саду выглянуў прамень
і скача па падушцы.
Ах, прыйдзе, прыйдзе ясны дзень
на радасць весялушцы!

А мне ні радасці, ні сну —
твой цень прыліпнуў калькай!
Мо ад таго іду ў вясну
я заваднюю лялькай.

Смяюся, плачу, шчабячу
на даўжыню завода...
І як пакутліва маўчу,
калі між намі згода.

1978

* * *

А на душы і светла, і шчымліва.
Разгубленасць спакоем наталю.
І ціхае скажу табе: «Шчаслíва!»
за тое, што цябе не палюблю.

За свой спакой, за ветлівасць пагляду,
за той агонь, што сэрца не апёк,
і буду ўдзячна, можа, нават рада
твой профіль тонкі прасачыць здалёк.

1978

* * *

Павер, качаны. я — ў даўгу!
Калі б яшчэ мацней любіла,
мяне б не так самота біла,
што нават плакаць не магу.

Не маю права на дакор,
сваім каханнем ахвярую
і нават восені дарую
сляпое ззянне стылых зор.

Бо не спазнаць ніколі ім
кароткага кахання ўпотай,
цана якому — адзінота,
наканаваная дваім,

1978

* * *

Прастора спазнаецца ў руху...
А як спазнаць цябе цяпер,
калі пакінуў толькі скруху,
і сэрцу, і душы — знявер!

Няўжо замкнёна моцна кола?
Я ж ганарліваю была...
Сляды, твае сляды наўкола,
завея іх не замяла.

А ты прыйдзі, яшчэ не позна,
ты перадумай, пазвані!
О, як натхнёна і высозна
гараць надзей маіх агні!

1978

ПАСЛЯ ДАЖДЖУ

А на стале маім пяўкоі,
і лёгка мне ўдыхаць азон.
Дарма казаў ты, што ніколі
не вернешся пад мой балкон.
У міг адзін раскрыю дзверы,
зірну на мокры парапет,
туман разрэджаны над скверам,
нібы дымок ад цыгарэт...
Як памяць сэрца заказыча!
Кране тугой вільготнасць дрэў...

Замест цябе з прысад пакліча
самоты квят — ільвіны зеў.

1978

* * *

Выпадкова, без пэўнай прычыны,
спачувальна і не без ласкі
мне сказала твая жанчына:
— Вы, як ліска з японскай казкі.
Муж чытаў мне яе няспешна,
надта ж простая тая навука:
за празмерна салодкай усмешкай
не інакш як сардэчная мука.

Я нічога ў адказ не сказала,
ды тужэй зацягнула пасак...
Там, табою забыты у зале,
ляжыць томік японскіх казак.

1978

* * *

Не тое гора, што гарчыць.
Бяда з нягодамі сплывае.
З гадамі вывучуся жыць,
бо сталасць роздум набывае.

Вяртанняў болей не хачу!
У адзіноце — кожны горды.
Дык хай жа ёю заплачу
за гэты крык, застраглы ў горле.
За гэты згустак крыўд і здрад,
за боль, якому ў сэрцы цесна,
за першай ночы зарапад
і вір бяссонніцы балеснай.

Спяшайся без мяне ў вясну.
Зрывай з рабін вясёлых гронкі.
Я асцярожна загарну
табой пачатыя старонкі.

1978

ЗОРКА ПАЛЯВАЯ

Ах, не трывожце, сэрцу так балюча!
Ах, не прыходзьце прывідам у сны!
Я пабягу дарогаю гаючай
без Вас у далеч бэзавай вясны.

Я пабягу, шукаючы прытулак
нязбдзейсненым жаданням у гаі,
ад мітусні, ад звону шумных вулак,
туды, дзе ноч калышуць салаўі.

Калі ж узыдзе поўня караваем,—
пазбавіць сэрца смутку і нуды!
У ім пакіне зорка палявая
свайго святла гарачыя сляды.

Ласкава буду зваць яе сястрыцай,
ў начное неба кіньце свой пагляд...
Магчыма, зорка весняя іскрыцца,
а можа, я плыву за далягляд!

1978

ПРЫ ЗНАЁМСТВЕ

Мо ад таго, што ён твой цёзка,
рукі яму не падала,
а толькі паглядзела дзёрзка
і ганарліва адышла.
А ноччу плакала ў падушку,
дзень сустракаючы раўмя,
і ён упарта мне на вушка
зноў паўтараў тваё імя.

1978

* * *

З табой даўно не гаманілі,
а рэха голасу плыло
з велікарускае раўніны
у беларускае сяло.

То адзывалася праклёнам,
то пераходзіла ва ўсхліп,
перагаворвалася з клёнам
і аціхала ў цені ліп.

А я ваколіцу мінала
на схіле гаманкога дня,
сунічнай брагай сустракала
мяне шчаслівая радня.

Пасля гарэла, як трохкутнік,
сузор'е пад акном маім,
і штось ласкавае трыпутнік
шаптаў мне голасам тваім.

1978

* * *

Наша вуліца каруселіцца,
плошча круглая — кола мар!
Сёння вечарам тут паселіцца,
можа, Ўдовін сын, мо вядзьмар.

Я ж прыкрыюся хустай з кужалю,
пасаджу за стол месяц май,
калі Ўдовін сын, будзе суджаным,
калі іншы хто — не чапай.

А ў акно маё вецер ломіцца,
сябра верны сцюдзёных зім,
і крычыць палахлівая горліца:
— Ўдовін сын! Васіліса пры ім!

1978

* * *

Я толькі пагляджу.
          Я не скажу ні слова.
Не ў сілах папракнуць,
          маўкліва адыду,
той лес, які прыняць была гатова,
бяжыць на павуцінным паваду...
Шукаем вінаватых і ўздыхаем,
смакуем водар бесклапотных дзён,
адзін другога ў здрадзе папракаем
і адзіноту ведаем здавён.
Чакаем навальніцы,
          ветру,
          грому,
маланку просім вузел рассячы,
вяртаемся дамоў —
          халодна ў нашым доме,
мы апускаем вочы і маўчым.

1978

* * *

Зіма размашыста пазначыць
сумётам схіл берагавы,
і немагчыма ўжо зынначыць,
як лёс, той накід снегавы.
Абую матчыны валёнкі
і папрастую наўздагад
туды, дзе тонкія сасонкі
журбою высветляць пагляд.
Туды, дзе хіліць долу голле
цяжкая снежная кайма,
сасонкі, рэчка, потым поле,
і большага ў мяне няма.
Табе прасцей, пейзаж прырэчны,
ты мне з гадамі даражэй,
і ад учынкаў недарэчных
цябе прырода ўбераджэ.
А я вяду з сабою сваркі,
хачу на шчасце дні нізаць,
і немагчыма без памаркі
з жыцця жыццё перапісаць.
Іду да некага з віною,
і нехта прыхаваў віну,
і дзень удачы — навіною,
і тыдні страт — не ў навіну.
Сняжок задзірыста іскрыцца,
ля сосен запаволю крок,
дзе, ну зусім як я, храбрыцца
чырванагруды снегірок.

1981

* * *

І лістоце апалай няўлежна,
з ночы просіцца ў расцяроб,
як спакойна, як незалежна
ён цалуе не ў губы — у лоб!

І не верыць ніводнаму слову,
з анямелаю ходзіць душой,
быццам тут аднялі ў яго мову
і ніяк не навучаць чужой.

І ў мяне дастаткова пагарды,
не хілю перад ім галавы,
у яго я і слова не варта,
а не знае, што мною жывы.

1981

* * *

Вы маю неспакойнасць уважце.
Людзі добрыя, гэта ж — вясна!
Маладое, трывожнае шчасце,
недапітая радасць да дна.

Вашы мілыя твары — не маскі!
У вачах я вясну пазнаю...
Людзі добрыя, нельга без ласкі,
дык уважце пяшчоту маю.

Я стаптала сцяжынак нямала,
пакідала гаркоту ў слядах,
я адчайна чаромху ламала
ў салаўіных зялёных садах.

Хоць бы раз закрычала са злосці,
зубы сціснуўшы, долю кляла:
я чакала каханага ў госці,
з некаханым у лета ішла.

Памірала — жыццё ратавала,
млела поўня ад шчасця ў акне,
я сябе толькі ў снах шкадавала
і бяздумна ішла па вясне.

Размывае ізноў каляіны,
не шкадуючы сілы, яна,
і высвіствае сад салаўіны
недапітую радасць да дне.

1981

* * *

Ах, нездарма жыла я ганарліўкай,
чакаючы цярпліва той званок!
Цябе частую леташняй наліўкай
і з дзьмухаўцоў пляту сабе вянок.

Над горадам сваволіць май гуллівы,
я пакланюся зводдаля яму,
а гэты дзень, высокі і шчаслівы,
як сонца, над зямлёю уздыму.

1981

МУЗЫКА

* * *

Мне не ставала толькі музыкі,
усё астатняе — было!
Дык заіграй жа, промень вузенькі,
каб аж дрыжала ў рамах шкло.

Кідаю вобзем кубак пеністы,
гуляю звонка ад відна,
і смех вясёлкаю праменістай
іграе ў кропельках віна.

З чаго ў мяне такое свята?
Цяпер ужо не зразумець!
Іграю я, іграе хата,
і абяцае клён шумець!

Ён пад акном за вартавога,
але да музыкі ахвоч:
было б яе багата ў бога,
а мы змаглі б гуляць і ноч.

Гуляць адчайна і трывожна...
Ну, што мне чалавек той дасць,
куды аднойчы з раздарожжа
заехала пабавіць час.

Міналі дні з дажджом і з пылам,

мне б зненавідзець, знелюбіць!
Ну, што з таго, што стаў ён мілым,
калі павінна я забыць.

Забыць!
          Забыць!
          Там бераг — коўзкі,
чужое для мяне імя,
там нават гіпсавы Чайкоўскі,
але там музыкі няма!

Там для мяне не заіграе
хоць бы ў адну струну душа,
ляціць наўсцяж мяне прамая
у адваротны бок шаша!

А я з душы зрываю гузікі —
такая сёння весялосць!
Мне не ставала толькі музыкі,
цяпер яна,
          дакладна,
          — ёсць!

* * *
Калі западае клавіш —
бездапаможныя ноты,
навошта позіркам славіш
прычыну маёй самоты?..
Ужо ападае лісце,
па ім, як па светлым праёме,
вяртаюся ў тое «калісьці»,
ў якім мы, на жаль, незнаёмы.

* * *
Якая музыка была!
Маўчыць начны праспект сталіцы.
Пазычу пёрынку з крыла
у заблукалае арліцы.

Каб лёгка, дзёрзка мне ўзляцець
над неадліпнай адзінотай,
дзе знуджана траве гудзець
басовою цягучай нотай.

Траве, якую шэрсціць град,
дзе грэе лапкі птах азяблы
і спакушае жонак гад
пакаштаваць таемны яблык.

Траве, дзе ладзяць мурашы
на дождж устойлівыя соты...
Як лёгка выпырхнуў з душы,
ужо не ведаецца — хто ты?!

Ці сябра, мілы на гады,
ці вораг, памяццю закляты,
ляцець... ляцець няма куды,
акром шчаслівага — дахаты.

Спакойна сесці да стала...
Якое ўсё-ткі неба мела!
Якая музыка была!
І, дзякуй богу,— адшумела!

1981

ПЕРШАЕ ВЕРАСНЯ

Бяруцца скупа жоўтым кроны,
сумуе восеньская медзь.
Ён думаў, сэрцу забароніць
аб ім жывую памяць мець.

Я сапраўды нямнога помню,
знаходжу ў справах супакой,
бяжыць па тоненькаму промню
пачатак верасня ў пакой.

З ахвотай школьнік занатуе
на уроку летнюю пару,
і што было, пра што шкадуе
даверыць сшытку і пяру.

Мне не стае яго старання,
і пачынаю разумець:
не трэба сшыткаў для падання,
дзе можна памяццю гарэць.

1981

* * *

У лясы, у гаі павядзе
вераснёвых начэй калыханка,
на зялёнай азёрнай вадзе
ліст каліны, нібы выразанка.

Не стаміцца б дачасна ў хадзе,
аджалкуе жалобаю восень,
адплыве па глыбокай вадзе,
што хацелася, што не збылося.

Хай жа кветкі ў палях адцвілі,
хай круты пад нагамі пагорак,—
многа спраў у мяне на зямлі,
многа ў небе нягаснучых зорак.

Вераснёваму дню ружавець
і дажджам лютаваць — справядліва,
трэба ўволю паплакаць умець,
каб умець пасміхацца шчасліва.

1981

* * *

Ластаўкі сядзяць напагатове,
крок неасцярожны і... зляцяць.
Сэнс таемны чую ў кожным слове
і баюся позірк свой падняць.

Аддае бульбоўнікам зляжалым
(трэба ж нечым полю прывячаць),
як неўтаймавана лёгкі шалік
зноў ірвецца да твайго пляча.

Я на смеласць гэтую злуюся,
шалік свой зацягваю мацней,
ластавачак спудзіць не баюся,
а за сэрца стала страшна мне.

1981

ГОСЦЬ

1
Яшчэ на сёння клопат ёсць:
суняць бы неяк грай шпачыны!
А тут насмешка лёсу — госць! —
да адзінокае жанчыны.

Вясёлых спраў паслугачы —
іскрынкі горкія ў наліўцы,
і сэрца трэба ўберагчы,
і штосьці д'ябальскае ў грыўцы.

І запытальны ўзлёт брыва
не хоча з роздумам спрачацца,
у небе поўня, хоць зрывай!
Пры гэткай толькі цалавацца!

Як патрабуе этыкет,
адводжу позірк сарамліва,
жыццё бясконцае ў планет,
і век кароткі — у шчаслівай!

Нямнога шчасця для дваіх! —
не першы дзень жыву з маркоты,
што для яе кароткі міг
расцалаванае гаркоты?!

Я не хачу гуляць з агнём,
я закрываю шторай поўшо
1 ненавіджу за акпом
асалавелую... шпакоўню.

2
Скуль ты такі невыносна адважны?!
Моцна зацягваеш ніць...
Гэта мясціна завецца ў нас Дражняй,
можа, цябе падражніць? —

Голасам ціхім, ласкавым паглядам,
бояззю ранняй тугі,
нам бы на луг, ды яшчэ да калядаў
расстагавалі стагі.

Соладка спяць гарадскія кварталы,
сходы бягуць, як гады...
На астраўках каламутных праталін
нашае ночы сляды.

3
Золка... Золка, ласкавы мой госцю,
я смяюся, мой голас дрыжыць,
між тваёй і маёй маладосцю
поле белага снегу ляжыць.

На якую чарговую згубу
шоўк завейна абцягвае стан,
не цалуй перасмяглыя губы,

ты душу напачатку дастань.

Знаю, смелым няма пакарання,
піць пачаў — дакаштуйся да дна,
можа, пас ашукае світанне,
ды далёка яшчэ да відна.

Ты паслухай, як дыхае цяжка
нам у твары начны веснавей,
і не вельмі славутая пташка,
як апошні пяе салавей.

Там дзе падаюць,—
сцежку не мосцяць:
мне над ногі не надта сцялі,
без таго твая дужая постаць,
нібы бераг жаданай зямлі.

З трапятаннем ляснога аленя
затрымайся на строме начы,
пакладзі галаву па калені
і над доляй маёй памаўчы.

4

Бясстрашны, уступай ва ўладу,
даю павечныя правы,
замацаваныя паглядам
скаронай гордай галавы.

Я не шкадую сёння волі,
застыў агонь яе ў вачах,
світальны месяц любіць поле,
ён толькі — ценем у нагах.

Пад гэтай цьмянаю аховай
улады хочацца ўдвая,
я — літасці прашу на словах,
дыханнем гавару — твая...

5

Я лішняга сабе не назапашу,
свайго ў жыцці ніяк не дабяру,
заві, мой госць, гукай у лесе нашу
запознена харошую пару.

Зямлю калыша год невысакосны,
а хочацца мне высака ўзляцець,
хай ноч усю шумяць над намі сосны,
ім сёння ёсць пра што пашапацець.

Ігліцы перасохлае пароша!
Пінжак далей у зараснік пасунь,
мажліва, лес з прытулкам не паможа,
дык дапаможа ў шчасці нам лясун.

Калі ў руках трымаеш яблык спелы,

не думаеш пра сад чужых зямель,
з табой не я была ў вясельна-белым,
а тут... туман, як вэлюмная бель.

Прасі, мой госць, садзі за стол заручын
крылатых дружак з тых, што галасней,
бо толькі птушкі голасам сугучны
і сэрцу, і абдымкам, і вясне.

Якім запевам нас яны напояць?!
Але не трэба птушкам многа ўмець,—
я аддаю сваю для песні споведзь,
ім лета будзе мала, каб прапець.

6

Не распытвай. Ты бачыш, што маю...
Я ўспаміны кідаю для тых,
што пяшчотна другіх абдымаюць
і сумуюць па вуснах маіх.

Не шкадую струны абарванай,
густа звоняць пад ветрам драты,
можа, песня мая — адспявана,
а душа захавала матыў.

Апранулі зялёнае вольхі,
я сукенку пад мак падбяру,
не загадваю, госць мой, на колькі,
дастаткова, што зараз гару.

У пунсовым сустрэну світанне,
хоць на колер, ды маю правы!
Нават кніжак няма пра каханне —
век халодным разлікам жывы.

Не хачу, каб дурэлі на шпагах,
і ў геройстве ёсць многа маны,—
не узважвай, мой госцю, на вагах,
знаеш... сэрца не мае цаны.

Не тужы. Раздажджылася трошкі,
ападзе ручаёвая плынь...
За аўсамі распусцяць валошкі
мне ў пасаг сваю ціхую сінь.

7

Не сціхае ў буслянцы
          ўстрывожаны клёкат,
разгайдалася ранне
          на крылах буслоў,
спатыкнецца прамень
          і ўпадзе трапятліва на локаць,
дотык вуснаў праз сон,—
          як працяг недаказаных слоў.

Спі, мой госць, спачывай...
          На рацэ распускаецца лотаць,
як маленькае сонца,

азірае свае берагі,
колькі ранкаў буслам
давядзецца над ёю адлётаць,
колькі выпадзе дзён
мне сустрэць на плячы дарагім?

Пралятае жыццё,
дзе маною, дзе праўдай,
пачынаецца лета,—
адчуваю далонню цяпло,
падступае, як прывід,
дзе да спуду сапраўдна,
над буслянкаю б'ецца
маладое крыло.

8
Зноў закружыла весялосць,
з акон злятае ноч, як сажа,
не абяцай спакою, госць,
што будзе заўтра — дзень пакажа.

Ды і навошта супакой!
Былі б далоні нашы ў згодзе,
я гавару ў паўшэпт з табой
і ў поўны голас са стагоддзем.

Нішто не спісваю на час,
я да яго жыццём прыкута,
хоць ён няўмольна (і не раз)
са мной разлічваўся — пакутай.

Мне горача... Бярэ разгон
на ўсходзе нітачка ўзыходу,
і ў тым наступным віры дзён
я для сябе не бачу броду.

А ў гэтай сцішанай начы
мне ад уласнай думкі смешна —
што час?! Як часта на плячы
каханым мулка і няўцешна.

9
Па шляхах жыццёвых ходзіць мноства
розных непрадбачаных нягод,
лепш бы павязацца нам сяброўствам
тым, што не на дзень і не на год.

Палкасць — бліскавічная крывая,
зводня расцугляных навальніц,
голас твой заве і акрыляе —
жаўранкам падранкавым звініць.

З маладосці выбегла на сцежку,—
тут бы супакоена прыстаць!
Госць мой, вераснёвую усмешку
з твару пацалункам не сагнаць.

Верасень... жаданы месяц збору,

над садамі лёгкая імгла,
госць мой, не насі ў вачах дакору —
многа мела — мала даиясла.

Абдымі... Хай пачакаюць зімы,
нам няма патрэб прыспешваць час,
палюбі пару маёй радзімы,
што пладамі выспела для нас.

І журбу, і вееялосць жалеек,
месяца світальнае святло,
пад якім твой жаўранак шалее,—
быццам яму лета не было.

10
Ты скажы мне, з якога суквецця
сплесці той запаветны вянец,
каб не чуўся у шолахах вецця
непрытоена сумны канец.

Гаварыла: прыкметам не веру,
разважала: надоўга! — і вось...—
варажу на сцяблінках аеру,
і выходзіць — прысуднае — госць!

Толькі госць...
            На прыход! — Не на і
Цяжкім хмелем спаўеш галаву...
З кожным новым тваім адыходам
разумею, што стратай жыву.

Не ўзыходзіць лістота на палі,
жывяць дрэва яго карані,
я баюся,— ты толькі абпаліш,
а гарэць не дасі на агні.

Не заву безмяцежнага шчасця,
свет здаўна да гарэння жадзён,
ды калі разгараюцца страсці,
просіць свет супакойлівых дзён.

Не капрыз. Не настрой. Не развага.
Горка сэрца гаворыць з табой,
знаю я, як цалуе адвага,
калі ўпэўнена — выйграе бой.

11
Што прыхопім з сабой? Што забудзем?
Дый няма асаблівых прычын
помніць гэты валошкавы будзень
і густое кустоўе ляшчын.

Маладая зязюля не лічыць,—
маладая зязюля — заве...
Напаслед я хацела б пазычыць
маладога кування ў яе.

Можа, гэта «ку-ку» парукае...

Госць мой, сёння дурманіць багун,
да цябе выбягае другая,
я паглядам таксама бягу.

Вось падкосяцца лёгкія ногі,
замінаюць трава і карчы,
я не знаю больш доўгай дарогі,
я стамілася, дай адпачыць.

Адыдзі... там шаўковыя косы,
чую смех, ён надобны на мой,
разганяю пад свежым пакосам
камарынае радасці рой.

І шукаю дадому дарогу
карацейшую... можна праз мох...
Не чакала, мой госць, да нарогу,
выйшла так... правяла за парог.

1981

* * *

Поле з восені, як паголена,
мне хадзіць туды — не дазволена.

Павяду вачмі, як рубель знайду,
адвяду пагляд і ў нуду ўпаду.

Столькі той нуды! Там адно — сляды...
Ды дарогі мне больш няма туды.

1981

* * *

Не прашу ні ў кога вернасці,
бо сама не без віны,
адпушчу цябе без рэўнасці
за далёкія млыны.

Позірк светлы не засмуціцца,
не складу ў жалобе рук,
а зямля мацней закруціцца
пад няроўны сэрца стук.

З хаты выбегу, здзіўлёная,
паглядзець на кругаверць,
скажуць людзі: «Улюбёная,
а ідзе, нібы па смерць!»

1981

* * *

Пахілы клён убор зялёны скіне,
пажухне за прысадамі трава,
і неўзабаве ляжа белы іней,
з яго не захмялее галава.
Ужо даўно гляджу на ўсё цвяроза,
не бегаю начамі за туман...
Бяссонніцы задумлівая проза —
далёка не чытабельны раман.
Было замнога пошуку і прагі
і веры ў дасканаласць тых людзей,
што, як і я, жывуць з адной адвагі,
па раздарожжы смутку і надзей.
Звядзе бяда, удача — раз'яднае,
а сэрца там, дзе хочацца забыць...
Найбольшую з уцех зямных спазнаеш,
каб самае нязначнае любіць.
Хоць тую ж баразёнку ў цені ўкропу,
густое крапівы пякучы плот,
мне часта сніцца таямнічы лопух,
а помніцца задзірысты асот.
У днях маіх няма вялікай драмы,
мінулае — сумленню не ў дакор,
а будучае — тупае ля брамы,
дзе непазбежна скіне клён убор.

1981

* * *

У кожным слове ёсць мастацтва,
жыве па прынцыпу адным:
з маленства ўступіш у свяцтва •
не назавеш павек чужым.

І з гэтай простаю высновай
у моцу сіл сваіх пяеш,
са слова пачалася мова,
а што я, людзі, без яе?!

1981

* * *

Маме

Як ціха яблыні шумяць
у нашым садзе,
мы адвячоркам ля акна
з табой прысядзем,
пачну расказваць пра сябе,—
табе цікава,
а мне лавіць бы на сябе
пагляд ласкавы.
Жаночы лес — няпросты лес,
я гэта знаю,
удосталь смеху, ўдосталь слёз
усё прымаю,
да сэрца блізка не бяры
мае нягоды,
яшчэ спяваюць салаўі
мне цераз годы.
Як ціха яблыні шумяць
у нашым садзе,
давай жа, мама, ля акна
з табой прысядзем,
цень адвячоркавы, густы
на шыбку ляжа,
табе пра тое, што утаю,
вясна дакажа...
1981

* * *

Не спатрэбяцца лёгкія вёслы,
далягляд над ракой адгарыць,
як жа цяжка бывае дарослым
толькі позіркамі гаварыць.
Рыбакі пасля добрага ўлову
пад сасною вядуць гаману,
не прасі запаветнага слова,
я ўсё роўна цябе падману.
Сцежка вузкая. Позірк глыбокі.
За ракою шумяць чараты.
Толькі надта ж той бераг далёкі,
ну, а гэты занадта круты.
Не для ўцехі цвітуць адвячоркі! —
Будзеш з іншымі словам лаўчыць,
нас не грэюць высокія зоркі,—
і душа безнадзейна маўчыць.
Правядзі напрасткі за развілку,
тут залішне выразны абрыў,
я, магчыма, прыму за памылку
калі-небудзь і гэты разрыў.
У жыцці недалётаў даволі,
можа, долі сваёй не ўлаўлю,
не схачу разняволенай волі
і ў сабе успамін палюблю.
Стане позірк, як зараз, глыбокім
і праз зараснік лесу густы
уваткнецца у бераг далёкі,
абрываючы бераг круты... 1981

* * *

Паверце тыя, хто згубіў
на светлы дзень надзею ў сэрцы,
хто, прагнучы любві, любіў
па той адной высокай мерцы,
што нам даецца толькі раз,
якую доля выбірае,—
нішто не страчваецца ў нас,
нішто ў душы не адгарае...

О, як аднойчы запяе!
Душа няхай сабе і зрэдку,
па-веснавому растае
і ў нас саміх ідзе ў разведку,
каб адшукаць той нерв слабы,
што ў нас агнём жывым пульсуе,
нерв неразумны і сляпы,
які закружыць, завальсуе...

Пяе! Душа мая пяе!
Ізноў любві ўзыходзіць зорка...
І мне ў праменнасці яе
чамусьці горача і горка.

1981

* * *

У тваіх блукае валасах
месяц, а ў вачах блішчыць рыжынка,
мне ж бацькамі дадзена ў пасаг,
на ўсялякі выпадак, смяшынка.

Я гадзіны гэтыя люблю,
справа не абы ў мяне якая,
месячык, старанная, лаўлю,
рукі маладыя апякаю.

Затрашчыць уночы ледастаў,
валасы твае мякчэй за кужаль,
ты яшчэ і сябрам мне не стаў,
а гаворыш: будзеш добрым мужам.

Ды чаго не скажа маладосць!
Да акна прыбілася сняжынка,
і чамусьці добра знаць, што ёсць,
на ўсялякі выпадак, смяшынка.

1981

* * *

Ля крыніцы бруістае вяне
абранёны на шчасце вянок,
тут калісь палявалі славяне
на чужых даўганогіх жанок.

Паўтараецца многае ў свеце,
на палянцы распалім касцёр,
і заблудзіцца месяц у вецці,
як лязо агнявое, васцёр.

У тваім сінявокім абліччы
я славянскія рысы знайду,
стань жа сёння маім паляўнічым,
я сама пад руку пападу.

І ад радасці хмельнае грузны,
абмінаючы дрэвы і пні,
прыпадзі да распаленых вуснаў
і ў высокія травы шпурні.

Закрычы па-дзікунску штосілы,
абрываючы сукню з пляча,
каб сарвалася дрогкае: «Мілы-ы»
і хіснулася неба ў вачах.

Каб на самым абрыве палянкі,
дзе ў калена густая трава,

ўпадабала я лес паланянкі
і надломы крутога брыва.

1981

* * *

Шчасліваму і гора дапаможа,
ды ўсё часцей жыццёвы калаўрот
бязлітасна заве у падарожжа
да адзіноты, смутку і згрызот.

Жыву, нібыта долі сваёй вырак,
самотна вочы сінія глядзяць,
і толькі думкі ў невядомы вырай,
нібы лісткі апалыя, ляцяць.

1981

* * *

Адгукнуўся смуткам шолах
сакавітых летніх траў,
у душы гуляе сполах
абяцаных мне забаў.
Не гляджу цяпер з тугою,
як бывала, ў цёмны кут,
падзяліла лёс з другою,
падзялю і боль пакут.
Не паверу, што шчаслівы
ты ў агні яе начэй,
зноў сустрэўшы палахлівы
позірк сцішаных вачэй.

1981

* * *

Дзе кружылі мае жураўлі,
беспрытульна плывуць аблачыны,
невыразныя цені ляглі
пад акном з надта простай прычыны.
Гэта верасень блытае зноў
са спякотаю мокрую навісь,
бо калі адыходзіць любоў,
прачынаецца злая нянавісць.
Не адношу сябе да святых,
толькі як заставацца сябрамі,
калі тысячы вёрстаў зямных
пралягло ў адзін момант між намі.
Што вы ведаеце пра страсць,
пра душу, расхінутую насцеж,
хай вам жонка адданая дасць
найсалодкае звонкае шчасце.
Увап'юцца ў акно вастрыём
касякі мудрагелістых кропель,
там, дзе білася сэрца маё,
ў перасып праганяецца попел.
Немаведама нават за што
ноч бяссоннем пранізлівым пыжыць,
ёй гарэць ці калець ўсё адно,
як жа мне ў гэтым холадзе выжыць?!
Пераходжу на здзеклівы лад,
трэба ж восені золлю адкрапаць,
і здаецца спакойным пагляд,
і чамусьці баюся заплакаць.

1981

* * *

Пад соннай ёлкі калыханне,
пад навагодні лёгкі вальс,
дзеля бясконцага чакання
я адмаўляюся ад вас.

Пайду дарогай снегавою
на мроях шчасця варажыць,
каб вам з жанчынаю другою
аб лёгкай страце не тужыць.

Якой надзеяй сэрца песціць?!
На кожнай здрадзе свой закон,
а без закону — толькі песні
душою пішуцца спакон,

1981

* * *

Лета вяртацца не ўмее
на межы свае ізноў,
сэрца мае сталее —
доўга не носіць рубцоў.

Сяду ў парозе, як некалі,
вецер абвее твар,
быццам купцы праехалі
ды зганьбавалі тавар.

Хмары ідуць аблажна,
мне думалася спярша,
не зашчыміць трывожна,
сцерпіць разлуку душа.

Што ж гэта ў свеце дзеецца,
доўга няма маразоў!
Хочацца мне абнадзеіцца —
вернецца лета ізноў.

1981

* * *

Адплывуць за пясчаную выспу
адгарэлага лета дымы,
я цябе адзінотаю высню,
ты мяне напаслед абдымі.

Ноч агнямі ў акне адміргае,
прымуць новыя нас берагі,
за мяне дакахае другая,
за цябе дацалуе другі.

Валасоў маіх ніць залатая
ападзе на гарачую скронь,
не трымаю! Няхай адлятае
неразумнага сэрца агонь.

На галінах, ад ветру каляных,
захлынаецца лісце ў журбе,
у імя несустрэтых каханых
я аднойчы забуду цябе.

Там, дзе верасень пройдзе ўрадлівы,
дзе крынічны заб'ецца выток,
упадзе на зямлю сіратлівы
адгарэлага лета лісток.

І ніштто не ўстрывожыць з гадамі,
не ўсхвалюе чаканым званком,
за цябе адсумую радкамі,
за сябе абляцелым лістком.

1981

* * *

Даруй і дзякуй! Вольная цяпер.
Ужо непадуладная нікому,
праз адзіноту, смутак і знявер
вяртаюся шчаслівая дадому.

Даруй за недазволены агонь,
за боль і безнадзейнае: кахаю...
Мо ад таго бунтуе радасць скронь,
што сёння толькі вецер абдымаю.

Я дзякую табе за смех ў бядзе,
за пачуцця і думак першароднасць,
дык хай жа мой радок цябе вядзе
ад позірку майго — у бессмяротнасць.

1981

НА БАЛКОНЕ

На балконе адвячоркам
І кветкі ўвішна я палю,
як узыдзе ў небе зорка,
я слязою іх палью.
Ты, сусед, не пасміхайся,
не багата ў нас выгод,
маёй хаты не цурайся,
паглядзі,— які гарод!
Хоць і кветкі, а расліна,
зацвілі, нібыта мак,
я табе сказаць павінна,
ты, сусед, усё ж дзівак!
Я цябе рукою гнуткай,
як лазою, абаўю,
дык заходзь, сусед, я хутка
свае кветкі дапалю.
Хоць і ведаю, што хтосьці
будзе ўнізе ноч стаяць
і каменьчыкі са злосці
у гарод у мой кідаць.
Не баюся, хай кідае,
не было б другіх нягод!
Пэўна, нехта забывае,
што высока мой гарод!

1981

НАВАЛЬНІЧНАЙ НОЧЧУ

І ўсё ж нашу я ў сэрцы спадзяванне,
што вернецца да берага паром,
таму не наракаю на расстанне,
спакойная, ўслухоўваюся ў гром,
бо ведаю: і той, другой, не спіцца,
і бліскавіца ў тым акне ярчэй,
дык хай яна баіцца памыліцца —
у тых агнях агонь маіх начэй...

1981

* * *

Я з душы сваёй вырвала слова
і яго акрыліць не змагла!
За абдымак куплю ў птушкалова
маладога над восень шчыгла.

Каб сшалелы, не проста з настрою,
а з высокае гэтай цаны,
заспяваў ён што-небудзь такое...
рызыкоўнае... наўзманы.

Падхаплю перасохлым дыханнем,
што ж ад змоўклага лета чакаць?!
Ці не лепш мне з вучнёўскім стараннем
ссалавелай душы падпяваць?

Ветры моцныя ў шыбы ляскочуць
затуманеных з рання акон,
дзесьці бабы дарэмна сакочуць,
што бясслаўна лячу пад адхон.

Дзякуй богу за нораў нязломны,
непрывыклы таіцца наўзбоч,
аддаю супакой свой скаромны
за адну разгавелую ноч.

За адно акрылёнае слова...
І на добрую славу шчыглу

абдыму яшчэ раз птушкалова,
а іначай і жыць не магу.

1981

* * *

Калі б я знала, што — ў гадах? —
была б да ўчынкаў асцярожнай,
ды нават слова па складах
раскласці не заўсёды можна.

Калі б я знала,— дзе, калі? —
узнікне тая агароджа
зямлі, дзе ўжо няма зямлі,—
не пражыла б і дня, быць можа.

Калі б я знала, што няма
душы, каб мне душой прыпасці,
я не чакала б, я сама
сабе адмовіла б у шчасці!

Калі б я знала?..
Свеце мой,
я не хачу глыбінь пазнання,
дай, чым ты жывы, мне жывой,
каб знаць, за што плаціць дыханнем.

1984

* * *

Жыву як ёсць, не без заганы,
і не нясу журбы гадам,
і, можа, я другім каханым
сябе па кропельках раздам.

І ўсё, што снег не зацярушыць,
сплыве вясною па вадзе,
і што там губы! Нават душы
не сутыкнуцца анідзе.

Ні тут, ні там... у снежнай сіні,
ах, не пра гэта мой радок,
навошта несці ва ўспаміне
сатлелай памяці грудок.

Пары харошай — недарэчнасць,
на спад збіраецца зіма...
І застаешся ты, як вечнасць,
і знаю,— вечнасці няма.

1984

ВЯЧОРКІ

1
Не ламіся ў хату, вецер,
толькі косаньку памыла,
прытаіўся пад павеццю
найхарошшы, ды нямілы.
Стану косаньку часаці,
з рук грабеньчык выпадае,—
не змагла ў пару сказаці,
сам, чакала,— запытае:
ой, чаму ў садку зялёным
мая сцежка дый пры ружах,
а яго сцяжына ў полі,
І над ёю ліха кружыць.
Ліха чорнае, як ночка,
сам, чакала,— запытае:
хто мне ў косаньку ў садочку
ружу дзікую ўплятае.
Уплятае, рук не коле,
я калючкі пазразала,
да адной сабрала з долу,
пад павеццю раскідала.
Каб не ўлез у тое смецце
найхарошшы, ды нямілы,
ты скажы яму, мой вецер,
што я косанькі не мыла.
Шчэ не мыла, не часала
І вадзіцы не насіла,

бо калючкі я зразала,—
ружу дзікую губіла...

2

Як спраўляліся заручыны,—
маладым віном паіў,
налічыў мяне прыручанай
дый у белы свет пусціў.

Як спраўлялася вяселейка,
з ціхім гонарам глядзеў:
— Ці ж знайшлося ў свеце зеллейка,
за віно што саладзей.

І знайшлося, і пілося, як атручана,
а паслалі да таго, кім прыручана.

1984

* * *

І ніколі ўжо не паўторыцца,
не падводзіць ні зрок, ні слых.
Адлятае, як быстрая конніца,
шчасце, лёгкае, для двух.

Не зусім была і жаданая,
вінаваты шал капяжоў,
а хацелася ж быць каханаю,
а чакалася ж — не ішоў!

Не загойваю, безбаязная,
дый не ўмею душу гаіць,
адпускаючы,— не прывязваю,
неўтаплёнаму — трэба плыць!

Не гарэць агню ноччу вогкаю,
навучы цяпер, як мне жыць,
каб змагла з рукі тваёй лёгкае
незабыўнага ды забыць!

1984

* * *

На ўсё, на ўсё кажу: мажліва...
Пры сонцы можна быць дажджу,
пры шчасці поўным — нешчаслівай,
а я — шчаслівая хаджу.

І можна быць пры ліставею
надзіва ціхае начы...
Я аднаго ўявіць не ўмею,—
хаджу шчаслівая пры чым?!

1984

* * *

Гэта ж проста восень адшумела.
Ліставеем сэрца апякла.
І растала ў снежнай дымцы белай
астраўком буслінага крыла.

І штодня душу я суцяшаю
у размовах з сябрам дарагім,
што няма прычыны для адчаю,—
гэта ж проста — выпалі снягі.

Рана думаць мне аб незваротным,
ці ж не усё роўна ў час які
супакойваць думкі небам родным
і цяплом прыветнае рукі.

Многа ў свеце позіркаў варожых,
толькі ж больш паглядаў веснавых,
вось таму і не кажу,— быць можа,
ўпэўнена,— дабрэе свет ад іх.

І калі я выйду заўтра рана
па квартал, прасветлены ад сну,
хочацца, каб нехта ў вочы глянуў
і пазнаў у іх сваю вясну.

Хочацца руку падаць і смела
падзяліцца думаю сваёй,—

гэта ж проста восень адшумела
раз каторы лісцем над зямлёй.

1984

* * *

З твайго саду да мяне на агеньчык.
Мікола Селяшчук, алей

У мяне палянка ёсць за садам,
многа там шыпшыны і травы,
дам табе высокую пасаду,—
будзь майго бяссоння вартавым.

Упадзе ў траву пялёстак клейкі,
задрыжыць расінка на плячы,—
адгукнуся голасам жалейкі,
каб не сумавалася ўначы.

Перадам з душы ўтрапёнасць слову,
што ірвецца спуджана здалёк,
у шыпшыннік, пад тваю ахову,
быццам саду лёгкі матылёк.

1984

КРАЯВІД З ХВАЛЯЙ

Хвалю ўстрывожыў ветраны ранак,
а размыты і згорблены бераг ракі,
як ужо некаханы каханак,
што пра гэта не знаючы, просіць рукі...

1984

УСПАМІН ПРА ЦЁТКУ ЯНЮ

Можа, кляў гаспадарку: гары яна гарам.
Можа, меў гостры зуб па суседа Кузьму
І, аднойчы ўскіпеўшы, яе ён ударыў,
і яна пакланілася нізка яму.

...І калі на вазок ён падсаджваў другую
у яе на вачах, як купец на карму,—
адвярнуўся ад слоў: «Як жа я давякую?!»,
і яна пакланілася нізка яму.

А пасля лугавінай, нібы па кіліме,
да сялібы вяртаўся ён цераз зіму,
задыхаўея ад думкі: «А раптам не
прыме?..)
і яна пакланілася нізка яму.

1984

* * *

Вось і заві бяседу мілай.
Да слова слова не лягло.
Адно ў імгненне акрыліла,
другое — крылы абсякло.

Патрэбна птушцы быць крылатай,
а людзям людскі знаць закон,—
па ім вазьміце памагатай
пускаць няўдачы пад адхон.

1984

ЦЫКЛАМЕНЫ

У нейкі час асенні ды праменны,
калі душу загойвае азон,
я пад настрой купіла цыкламены,—
далёкі ад турбот маіх вазон.

І лёгенька ўздыхнулі ў доме сцены,
і ўсё часцей пры горкіх неладах
я ў слове цыкламены — чула змены,
бы нешта йшло за мною па слядах.

Дыханнем кожны лісцік саграваЛа,
дык хто ж мяне ў наступным папракне,—
зіма такой кудасай праспявала,
нібы прайшло стагоддзе праз мяне.

І з недаўменнем стойкага салдата,
што нёс з вайны дамоў пусты рукаў,
я думала,— хіба ж я вінавата,—
не ўгледзела, калі вазон прапаў.

Больш не цвітуць у доме цыкламены,
я чую: вецер вые між антэн,
і ўздрыгваюць аглушаныя сцены,—
о, нам не трэба больш ніякіх змен.

1984

* * *

Шумела Свіслач, парк звінеў
лістотай, з верасня апалай,
няма віны ў маёй віне,—
чужой з твайго жадання стала.

З твайго маўчання, за якім
мне адпускаўся позірк строгі,
каб не назвала дарагім,
не збіла з правільнай дарогі.

Дзе гэтак многа праматы,
а я ў гадах зігзагам крочу
па тых слядах, што кінуў ты,
і лёс наперад свой прарочу.

Вунь замыкаюцца сляды...
Вакол сябе абводжу кола,
я не ўпушчу цябе сюды,
была твая па гэта воля.

1984

* * *

Жыццё, жыццё,— начэй і дзён паток!
Вяршу цябе ці ты мой вобраз вершыш?!
Ты стомленым у час даеш глыток
іі з ног збіваеш, неашчадна,— першых.

Спаецігла я тваё дабро і зло,
магу адрозніць праўду ад падману
і, за апору ўзяўшы,— што прайшло,
магу ў сваё наступнае загляну ць.

Ты мне ў адным не можаш памагчы,—
загадка тваіх ісцін самых простых:
чаму я ўчора плакала уначы,
чаму мне сёння сорамна ад слёз тых?!

1984

* * *

І я сказала: «Больш не трэба фальшу.
Зіма прыйшла. А вы — вясны кумір».
Ляжыць забыты на канапе гальштук,
зусім як нечаканы сувенір.

Дзятва бяжыць з гары крутой дахаты.
За гальштук быў бы ўдзячны снегавік.
А позірк мой таму і вінаваты,
што к гэткім падарункам не прывык.

1984

ЗАГЕДАН

...А Загеданка падпявала словам.
Плыў у нізіну сіні дым з Пхеі.
Пчаляр стары ў маліннiку за ровам,
нібыта пас пчаліныя раі.

Забудзь. А калі хочацца — пасмейся
з таго, як меркавалі да зары
мы выйсці ў ліпень наш па эдэльвейсы,
якія ён Каўказу падарыў.

Ноч Загеданку, нас — пераспявала,
бы рухнуў нечакана свет увесь...
Я толькі аднаго тады не знала:
не зацвіце ў даліне эдэльвейс.

1984

* * *

Не трэба мне надакучаць.
Душа казённых слоў не хоча.
...Як сонечна лясны ручай
між валуноў старых булькоча.

Хутчэй вярніцеся да спраў,
калі ж і гэтым не злячыцца,—
лавіце вецер. Ён украў,
што паміж пас магло адбыцца.

1984

ЛІПА ЦВІЦЕ

1
Ля прыёмнага пункта шклатары
маладзенькая ліпа расце,
там стаіць чалавек — без тавару,
цягне сонечны дзень пакрысе.

Так, нібы для здароўя карысна,
быццам справы няма гультаю,
я зашморгваю штору наўмысна
і тым самым — сябе выдаю.

Лепш бы картаю бітаю выпаў
ты,— што зараз глядзіш на акно,
лепш бы там, пад нявіннаю ліпай,
заглынула, як прорва, віно.

Грэх ці не!
Сонца ў небе — аладкай,
і зарубкаю — боль на ілбе,
і сукенкі глыбокая складка
пад рукой занямелай — глыбей.

Што таіцца? Я позіркаў прагну,
я сама, як агонь светлячка,
хоць і знаю, што з нашае праўды
пасталець можа ваша дачка.

Зразумее яна ці асудзіць?
Бачыць бог,— адвярнуць не змагла,
цяжкі камень усклала на грудзі,
лёг,—
як зорка ля сэрца ўзышла.

Вас!
Навошта панёс гэты скоры?
Вам схлушу, а сабе не зманю,—
адхінаюся гэтак ад шторы,
бы глынула знянацку агню.

І маленькага сэрца удары
шле да ліпы ўзбуялая плоць,
І займаецца там, ля шклатары,
першацвету няяркая жоўць.

2
З чужое ночы ён прыйшоў
у вечар мой, у песню голля,
на мне сукенкі белы шоўк,
нібы настольнік для застолля.

Застыла ліпа, як струна
(чужэюць гэтак з недаверу),
быццам паклікала яна
мяне на тайную вячэру.

Двару глухому дорыць пах
І пад сабой — чакае змовы,
а на маіх зямных губах
няхітрыя смяюцца словы.

З таго, што выжла верна спіць
і куст шыпшыны коле рукі,
што я не помню, як баліць
душа з любоўнае разлукі.

3
Бываюць дні, калі раптоўна
з пустога, ну няма з чаго,—
выключна робішся тактоўнай
і любіш ворага свайго.

І злыдня называеш братам,
не чуеш злосніка брахні,
і што ні дзень — сама расплата
за крыўды ўсе і за грахі.

Няўжо набеглі дні такія?
Дазвол на ўсё, што ні зраблю!
Вы загадайце мне — і кіем
я зорку мамантам саб'ю.

І вам аддам.
І ўсё няпраўда.
Мана!
Ружовенькі наіў!

Калісьці ж прыйдзе тое заўтра,
што ўсё аголіць, як адліў.

І злыдзень застанецца злыднем,
і вораг — ворагам маім,
зласлівец — адчувальна вытне,
а ў вочы пусціць сіні дым.

І зорка — зоркай. Збіць не здольна.
І думка сумная шкрабе:
адно магу, і ў тым я вольна,—
З усім сваім аддаць сябе.

4
Прыляцелі і паселі
развясёлыя стрыжы.
Што сягоння я пасек»,
ты рукой сваёй сажні.

Можа, жыта, можа, проса,—
аддаю табе ўраджай!
Тым усім, што долі просяць,
на шчаслівую — раздай.

І сляпому, і глухому
з поўнай жмені сыпані,—
хто бяжыць ад скрухі з дому,
і таму, хто на кані.

А самому стапе крута,
толькі б я сказаць змагла,
чым закусваць жаль-атруту,
што ў душу тваю ўліла.

5
Мой шалік горнецца к цяплу,
а мне цяпло — чужая слава,
иервовы вецер я люблю
і тытунёвы пах гаркавы.
Сястра-сініца. І адной
мне зразумела песня птаха,
я, мілы мой, не пабіраха,
хоць і з працягнутай рукой.
Не, я цяпла не папрашу,
мяне ад сцюж затуліць хата,
мецьстала модна мецэната,
мне б — толькі родную душу...

6
Перавернецца свет, гэта ж праўда,—
        такое бывае,
як пужлівая лань, небяспеку пачуўшы,
бяжыш.
а яно, пачуццё, непазбежна, як стрэл,
даганяе
і спакусіць, як д'ябал,
        і кіне ахвярна на крыж.

Спакушай, не баюся ніякай пякельнае мукі,
мы ў жыцці размінемся, як цені
ад розных планет,
гэта ведаю я і насустрач працягваю рукі,
я — ахвяра твая, ты —
яшчэ не заселены свет.
Пазаві, адвядзі мне лясную палянку,
адвядзі мне пустыню, я там правяду арыкі,
пабудую там хату, павешу на вокны фіранкі,
ускапаю горад і пасею вясною гуркі.
Будзеш спраўна страляць — будзе ў доме
дзічына,
будзе піва варыцца і песня ірвацца пад столь,
а каб род працягнуць, параджу
пад вялікдзень я сына,
важна чарку падам і з дубовае бочкі — расол.
Як на справе далека ад явы трымаецца мара,
мы ў жыцці размінемся, як вогнішчаў
розных дымы,
будзе ліпа цвісці, будзе пункт
па прыёму шклатары,
запярэч, падкажы мне жаданае —
будзем і мы...

7
Дыхнула ў твар начною прахалодай,
праехала маршрутнае таксі,
кажу сабе: «Майстэрствам авалодай,
астатняга ні ў кога не прасі.

Няма віны — ніколі не вініся,
жыццё саткана з мёду і крыві,
на ім згары, і горка падманіся,
і зноў уверуй — з гэтым і жыві».

8
О, як жыву з адною толькі верай!
Ты адабраць мяне схацеў у дня,
дзе прыручыць змагла б я нават звера,
а тут — здаецца лішняй дабрыня.

Галіны ліпы шапацяць драпежна,
маўчаць салоўкі, і маўчаць гракі,
хачу ва ўсім застацца незалежнай,
хачу залежаць ад тваёй рукі...

9
Прад ім рассыпала душа
слоў залатых бярэма,
а ён ідзе, нібы паша
да пільных спраў з гарэма.

Яму і ласка — не закон,

загад — чужое права,
нібы жыццё даруе ён,
а смак жыцця — гаркавы.

Таму і ў вочы не глядзіць...
Забіла голлем ліпа
ў жаданні ўміг адгарадзіць
яго ад майго ўсхліпа.

А я не ўсхліпну.
            Ноч са мной
здаўна жыве ў саюзе,
паставіць тварам прад маной
і кіне ў шал ілюзій.

Ён прада мной — як за сцяной,
а лепш — за небакраем,
куды ўзмужнелы голас мой
па песні выбягае...

10
Я змагу сказаць — шчаслівa,
што не дадзена — не мець!
Буду думаць, што імклівa
развяла пас крутаверць.

І нідзе, ні ў якіх сферах,—
і зямных, і незямных,
як рака, размыты бераг,
не пачуеш слоў маіх.

Толькі доля вінавата,
а ў мяне яна адна!
Чарку п'ю з чужога свята,
і хацелася б — да дна.

У гняздзе для песень птушка,
а дасціпны б параўнаў
з той пасажнаю падушкай,
што вясёлы сват украў...

11
Зналася з пяшчотаю,
не займала й лёду,
свята — за суботаю,
а бяда — заўсёды.

Белая ці чорная?
З крапівой ці з ружай?
Воцат п'е законная
за нядобрым мужам.

Галубком ці воранам?
Плача ці смяецца?
Ля ўдавіцы зморанай
вужам абаўецца.

Я — і не законная,

я — і не ўдавіца,
я к табе, бяда мая,—
нізка пакланіцца.

12

Не біся так моцна, сэрца!
Мы пойдзем дадому.
Па нейкай ледзь адчувальнай прыкмеце
тваю адчуваю стому.

Цяпер бы пабегчы ў поле,
дзе ніхто не пабачыць,
як вачамі сухімі
над нечым сваім мы плачам.

І ўсё-ткі пойдзем дадому!
Плач прытрымаем у лёгкіх,
каб ніколі не думалася,
што дыхаецца нам лёгка.

Каб ніколі не верылася,
што пражыць можна
без таго, што ўсярэдзіне
варочаецца трывожна.
Каб не ўяўляліся дні
без солі і перцу,
перац — па стале,
а соль...— пад табою, сэрца!
Таму і вочы сухія...

13

А ліпа!
Ліпа як цвіце.
Дабрэй зямля ў часы цвіцення,
каго чакаць, чаго хацець,
якія клікаць летуценні.

Пакутны ямб, святы харэй —
дыханне пругкае работы,
з якой на свет гляджу мудрэй
над дробным друзам адзіноты.

З кутка ў куток...
За крокам — крок...
Шукае нерв жывой апоры,
а сэрца ўзмоцнены штуршок
вядзе руку да лёгкай шторы...

Шклатара. Астравок травы...
Няўжо! Адкуль? З якіх вышыняў?
Пад ліпай маладзенькай — вы,
і не адзін, пры вас — шыпшына...

Чакай, душа, яшчэ не час,
залатаць дай патрэбным словам...
А вы? Я выбегу да вас,
цяпер — у сцішана-ліловым...

Як ноч сама, як неба шыр,

жыццёвы міг — такі кароткі,
сягоння — з галавою ў вір,
а заўтра нават боль — салодкі...

1984

* * *

Ішлі на ясны і вялізны
шар поўні прама над вадой,
сказаў, што мне было б карысна
хоць раз адмучыцца нудой.

І скарыстала я параду,
і папрасіла: адпусці...
Ён там цяпер,— за даляглядам,
мне веку мала, каб дайсці.

1984

* * *

Раптам сонечна і блізка
позірк твой злаўлю.
Неба — жураўлю калыска,
я люблю зямлю.

З пахам кмену і каляндры,
толькі выйдзі ў сад,
абаўе, як хмель, гірляндай
дзікі вінаград.

Толькі сёння я не выйду.
Чуеш,— сэрца стук
мне расказвае пра крыўду
ад няверных рук.

Бо з чаго такі ліслівы,
хітры баламут?
Дай і мне пабыць шчаслівай
у агні пакут.

1984

* * *

Не схацела паклікаць у госці.
І, як толькі дайшлі да вугла,
развіталася рэзка, са злосцю —
абнадзеіць нічым не магла.

А па горадзе дзіўная чутка
з хаты ў хату з той ночы плыве,
быццам ён непрадбачана хутка
перад богам сваёй назаве.

Снег злятае з карніза бялюткі,
да ўсяго стаў абвостраным слых,
я смяюся над дзёрзкаю чуткай
і чамусьці сцялю на дваіх.

1984

* * *

Не трэба папракаць у здрадзе,
я рада б крыкнуць сэрцу — не! —
але як соладка ён крадзе
усё, што лепшае ў мяне.

Таму ў кватэры нашай пуста,
таму не так, як у людзей,
маршчынкі згладжваю прад люстрам,
каб перад ім быць маладзей.

Цяжэюць грудзі ад жадання,
засведчы сам усё і згінь,
ужо лунае жар спаткання
у шолахах начных вяргінь.

І голас чуецца вясёлы,
а там, дзе месяц тонкі згас,
аплачуць за мяне анёлы
усё нязбытнае між нас.

1984

РАКА

Вецер лісце гоніць па дарозе.
Мне даўно няма каго чакаць.
Плешчацца, праклятая, ў парозе,
адзіноты чорная рака.

Творыцца няўмольнае ў прыродзе,—
сад правёў у доўгі шлях шпака,
нават прышлы чалавек не зойдзе,
з кожным днём глыбей — мая рака.

І звініць любая рэч у хаце
хваляй, што не знае астраўка,
нехта пазайздросціў на багацце,—
многа тоіць вод — мая рака.

Устаю — яна бурліць гулліва,
спаць іду — плюскоча весялей,
дзіўна, каб была я нешчаслівай,—
гэткая рака ў мяне! — але...

1984

РЫБАЧКА

Нясе цыбулю, хлеба булку.
Пяе — найлепшая з красунь —
пра даўнішняй работы люльку
і капітанскі злы тытунь.

Глыбокі жаль, і боль высокі,
і шкадаванне, і надрыў,—
лятуць за ветразем далёкім
і пападаюць пад прыліў...

І зноўку голас з новай сілай,
на тонкай ноце на адной,
збягае ўніз пясчаным схілам,
як бы званочак пад дугой.

Мне на пяску гарачым мулка,—
на падваконні за акном
ляжыць старой работы люлька
са злым, тым самым тытунём.

І ад чаго — сама не знаю,
я асцярожна з-за куста
у даль марскую падпяваю,
дзе ветразь беленькі растаў...

1984

* * *

...І растрывожыць халадок нізіны.
...І расхвалюе песня за сцяной.
Я не ўжылася некалі з адзіным,
а не адзіны бедаваў са мной.

Цяпер я знаю, чым яго трымала,
калі, як сведку, памяць прызаву.
Няхай бы лепш сама я бедавала,
бо толькі тым, адзіным, і жыву.

1984

* * *

У лёгкіх рухах чуе здраду
і заклікае: ты разваж...
Хіба не бачыш па пагляду,—
манюка ён і звадыяш.

А мне ад гэтых слоў салодка,
бо я яшчэ жыву ў тым дні,
дзе кружаць чаіцы над лодкай
і б'юцца ў сецях акуні.

Дзе рыбакі пра ўловы марацць
і пра харошы першы ўкос;
дзе пахне ветрам і загарам
той, што цяпер сядзіць наўскос...

І быць мне трэба нешчаслівай,
бо ён між вытанчаных фраз
глядзіць на стан мой палахліва,
як на гадзюку,— першы раз!

1984

* * *

Забыць і назаўсёды адысці.
Навошта —
Вы, і голас Ваш, і крокі?
Навошта дрэва марыць аб лісці,
калі цяпло ад дрэва так далёка?!

Адмовіцца, каб ведаць што знайшла!
Купіць білет, і слухаць Дзіна Рыда,
і чуць, як у душы смяецца крыўда
з таго, што вера доўга ў ёй жыла.

Адмовіцца! — насуперак кручыне,—
і гэта ўсё, што ў долю магу даць
не брату, не таварышу,— мужчыне! —
і вернасцю сваёю пакараць.

1984

* * *

Мы не хаваліся за фразы,
бо грэх — хавацца ад сябе,
дзе кожны пры сваёй журбе,
дзе кожнаму відно адразу:
стаім пад горасным вянцом...
А гэты шэпт і гэта ласка,
як недаказаная казка,
з ужо вядомым нам канцом.

1984

* * *

І сняжынка шукае прытулку,—
вунь, як роўна іскрыцца сняжок!
Ты даруй, што ў завейным завулку
папрасілася пад кажушок.

Што загадвала: «Будзь маім братам!»,
што хацела, каб рукі — да рук,
што цяпер толькі я вінавата,—
пад табою хістаецца брук.

Што ў такую ж іскрыстую поўнач
ты ідзеш, бы вядзе цябе кат...
Я прыбегла б скуль хочаш на помач,
каб не знала, што ты мне не брат!

1984

* * *

З адвагай рыцара-гулякі
завеш да кветак, на балкон...
А насупроць гучыць сіртакі
з напаўзавешаных вакон.

І ў гэтым рытме нетутэйшым,
пад дахам зорнага святла,
мы шлях сустрэч былых завершым,
як птушку выпусцім з сіла.

...Адбіты палкіх слоў атакі,—
не стала я тваёй зямлёй,
і плача горача сіртакі
ў акне па Грэцыі сваёй.

1984

* * *

Пра якія такія любошчы
загаворвае вецер са мной,
і танюткае голле палошча,
і ўзбівае сумёт пад сцяной.

Днее інеем мяккім світанне,
пад ільдамі вада, як іртуць,
і герані, герані, герані,
як відно, снегавыя цвітуць.

І пры гэтым бялюткім цвіценні
(мо віною таму халады?)
адазваўся ты вогненным ценем,
і завея прыкрыла сляды.

І ніхто разабрацца не ў сілах,
што і як наўздагон я кляла,
і якую надзею насіла,
і якім спадзяваннем жыла.

І якая адкрылася рана,—
журавіна ці кропля крыві,
па іскрыстыя ўпала герані,
а душа закрычала: жыві!

І жыву, і іду асцярожна,
развіднелай гару віднатой:

«Невозможное было возможно,
но возможное — было мечтой»[1]

1984

* * *

Даўно крыклівая малеча
гуляць пакінула ў сняжкі...
Як перабыць мне гэты вечар,
ён адзінотаю цяжкі.

На перамерзлым тратуары
гудуць вятры на ўсе лады,
спрабуюць будучым ударыць,
і перажытым б'юць гады.

Жыццё не вывернеш пальчаткай,
дарма гуляць з ім у любосць,—
канец ужо ў самым пачатку,
і баранюся тым, што ёсць.

1984

[1] Аляксандр Блок

EUGENIO[2]

1

І вось ужо ніяк не сцерці,
а хочацца хутчэй забыць,
і, можа быць, да самай смерці —
не знаць, не помніць, а любіць.

Самой сабе — пустая здрада,
у днях маіх было ўсяго,
а тут няйнакш ад канакрада
ёсць нешта ў позірках яго.

Звядзе табун і траў не вымне,
на нож рванецца без нажа,
і хоча адазвацца гімнам
на гэтае імя душа.

Прыцішваю, збіваю гукі,—
не знаць, не помніць, а любіць,
распасціраць насустрач рукі,
і прагнуць, і хацець забыць.

2

Кружылі ўчора ластаўкі высока.
Сягоння дождж — насуперак прыкмеце.
Маўклівы парк. Ракі трывожны рокат,
і кропелькі дажджу па парапеце.

Суладна думкам дыхае прырода,
мне добра ў цішыні яе і ў гуле...
Пачэсна жыць дзеля ўсяго народа
і цяжка для таго, хто ў прамінулым.

Я знала радасць таннае спакусы,
і тым мацней адна наліла вера:
на паўжыцця развіўся локан русы,
і... сум на волю мой ірваўся зверам.

Сляды паводкай шумнаю размыты,
а ночы тояць даўнішнія сны:
вакзал, дзе рэйкі, жалем перавіты,
і вецер дзьме, бы з бездані, скразны...

3

Жартуючы, сказаў: «Стратэг!»,
і жарту я не зразумела.
Глядзела весела на снег,
сябе ўяўляла ў шоўку белым...

І не хацела заўважаць,
як ён тужліва з-за галіны,
зірнуў удаль, нібы важак,
што страціў клін свой жураўліны.

Галіну выгінаў дугой,

[2] Высакародны (лац.).

мне гаварыў: «Маўчы!» — са смехам,
нібы тады ўжо слухаў рэха
слоў, што зляталі з губ другой...

4
Калі таполю вецер раскалыша
і над галлём ударыць гулкі гром,
далёкі друг самотны ліст папіша
пра свой бліскучы і гасцінны дом...

І я прыпомню пах салодкай дыні,
і як гарэў пад пальцамі паркаль...
Не ўмелі вочы юнай гаспадыні
пад вейкамі схаваць разладу жаль.

І раздражнёна, ад яе бяссілля,
ад слоў, што вымаўляліся ледзь-ледзь...
Я ад імя забытых папрасіла:
«Вось адрас мой. Успомніш, дык
прыедзь».

5
Пакажу табе лугоў абрысы,
завяду ў туман глухіх нізін,
у цябе, ў каго такія рысы,
быццам бы на свет увесь — адзін?!

У жыцці нялёгка жыць без мары,
дальні луг, як складзены шацёр,
тут даўно напісаны сцэнарый,
толькі патрабуецца акцёр.

Захіну рукой пагляд гаручы,
слабасць — зброя! Уступаю ў бой...
Абрываю камень з дзікай кручы,
а сачу чамусьці за сабой.

Вытрымка на поўнае дыханне,
ні ваганняў сёння, ні жуды,
я ішла на гэтае спатканне
без малога трыццаць тры гады.

6
Вараны, белагрывы ці гнеды,
атрасаючы попел з падкоў,
нёс пакутнае цела Рагнеды
у жалобную памяць вякоў?!

Не звіняць бранзалеты грэкіні,
і наложніц вакол не чутно,
можа стацца,— таксама пакіне,—
манастырскае ў поле акно.
І сумуецца мне да абеду,
а з абеду — сяджу пры акне
і паверыць хачу, што Рагнеда
ўжо адплакала і за мяне.

7
Яму б тапіць ільды ў лядоўні,
прыйшоў, пабачыў, перамог!
Цвіце разлапісты бульбоўнік
каля прапыленых дарог...

Дзе завяззю, а дзе цвіценнем
жыццё,— нібы глыбокі ўздых,
я на зямлю прыйшла не ценем,
прыйшла жывой — сярод жывых...

Быць урадліваму ўраджаю,
умее глеба ў нас радзіць...
Таму, хто заўтра прыязджае,
ці змогуць рукі дагадзіць?!

8
Чужая сабе і вакзалу,
бязмежнай хачу цішыні...
Ўпіваюцца ў скуру, бы джалы,
шырокае плошчы агні.

Як страшна, адчайна і часта,
сэрца маё — фантазёр,
наводшыбе гравій крупчасты
прымае за россыпы зор.

Праходзь, не спыняйся, прыезджы,
я ў горадзе родным сваім
сама змагу вызначыць межы
між будучым і былым...

Якое смяшлівае гора
за горкай дамоў растае,—
там лепшыя далі аддораць
усе несустрэчы мае...

Астудзіць, бы выветрыць, поўня,
пацешаць два цені ў акне...
Прысні, не сустрэты сягоння,
на плошчы шырокай мяне.

9
...А вясна набяжыць, нібы кара,
і апошні забудзе сумёт.
І пчала з дзьмухаўцовых абшараў
прынясе самы першы свой мёд.

Запрашаю сяброў на застолле,
выстаўляю віно і харчы,
і чагосьці ніяк не адолець,
першым мёдам вячэра гарчыць.

І не выльеш, не скажаш нікому,—
аддала б, каб ніколі не мець,
гэту горкую, нудную стому
за таго, хто ўжо далей за смерць.

Хто ні ўздыху, ні крыку не варты,
я сказала б жанчыне другой,
і сурвэтка, як бітая карта,
паслухмяна ляжыць пад рукой.

Ні сумненняў, ні жалю, ні веры,
а над нечае ціхае «ах!»
паднясла б галаву пад сякеру
з імем гэтым адным па губах.

1984

* * *

Валасы — як са спелага стэпу.
Стэп ніколі не быў дарагім,
а гляджу, удыхаю, і слепну,
І бяссільна зліваюся з ім.

На сцяжынах расла палыновых,
дзе ажыннік у месцах глухіх
мне шаптаў адмысловыя словы,
і рабілася млосна ад іх.

Я запомніла тую навуку,
не прымала ніколі за хлеб,
а, як зерне, кідаю на гуку
у губамі апалены стэп.

1984

* * *

Заместа слоў пачаўся снегапад.
А двор прапах смалою і ігліцай,
чаму мне гэтак страшна памыліцца,—
сказаць баюся нешта неўпапад.

Між ніцых дрэў зіма не ў першы раз
пагляд чаруе яркай белізною,
не трэба вам развітвацца са мною,
я, можа, ўсё жыццё чакала вас.

Сняжынак рой, як зорнае сяйво,
спяшае ноч да раніцы раскідаць,
прыкрыю твар шчаслівы рукавом,
каб вам безабароннасці не выдаць.

І позірк ваш дакорлівы злаўлю,
як ловіць промень веснавая хмарка,
няпраўда! Ну, якая ж я дзікарка,
хіба вам не відно: я вас люблю...

1984

* * *

Ужо не трэба шкадаваць
сардэчных слоў, размоў кароткіх.
Замерзла ў Свіслачы вада,
даўно пры сем'ях аднагодкі.

І нехта мой настылы дом
назваў пакутніцкім астрогам,
а я заўсёды за парогам:
пад кронай ці пад ліхтаром.

А найчасцей іду туды,
дзе ў час начны прахожых мала,
дзе зажурыўся наш Купала
над снежнем ясна-маладым.

Дзе пад сумётам ліст кляновы
заве з глыбінь зямных траву,
дзе я ва ўладзе той размовы,
што людзі споведдзю завуць.

1984

* * *

Прывязацца б душою і целам,
вочы б сінія прагна любіць,
колькі помню сябе — ўсё хацела
я жанчынаю вернаю быць.

Над закрытым стаю чамаданам,—
томік вершаў, сукенка адна,
а здаецца, жыццё спакавана,
чамаданчык ніяк не падняць.

Чую, хочацца сэрцу спачыну,
можа, верш свой апошні пішу,
і такія плывуць аблачыны,
нібы ў рай адпускаю душу...

1984

* * *

Не пагаворым болей, як раней,—
на ўсё свой час, на ўсё свая прычына,
няхай зычлівай ласкаю кране
вас нейкая далёкая жанчына.

Цяпер ніхто не скажа: вы — мой друг,
і вам не перадасць: яна — хваліла,
адцвіў той шапаткі вясёлы луг,
што некалі ў пісьме вам падарыла.

Цяпер яднае толькі тлумны свет,
трывожныя, пагрозлівыя з'явы...
Які ж адкрыўся дзіўны мне сакрэт,
што ваша — вам: жыццё, надзеі, справы.

Як палюсы, што дзеляцца зямлёй,
жывём, і ўсё падкрэслена няміла,
а гэта проста ласкаю сваёй
да кропкі з вамі я дагаварыла.

1984

РАБІНАВАЯ ГРОНКА

Рабіна гронкай распаліла
світанак там, дзе лес радзее,
я сёння зноўку паўтарыла
урок няспраўджанай надзеі.

Ты не адзін, а я зірнула
так, як глядзяць на закаханых,
нібыта ўпершыню адчула
ласкавасць рук, навек адданых.

Паўночны вецер быў лагодным,
і турбавала толькі тое,
што мой світэрак старамодны
залішне змрочным быў са строяў.

Шчаслівы міг чакаць кагосьці,
хацела засмяяцца звонка,
а ты не ўспомніў маладосці...
Бывай, рабінавая гронка!

1987

* * *

Нічагусенькі не зменіцца...
Глеба будзе адтаваць.
Будзе месячык над Сенніцай
шклінкай зыркаю ўставаць.

Не віхор з-за небакраю
грозна голас падае,
то з мяне мяне вымаюць
вочы чорныя твае.

Гаварыла: «Не пільную...
А забудзеш — не бяда...»
Думала, цябе шкадую,
выйшла, што сябе шкада.

1987

* * *

Не абяцаюць, калі ўсё — цацанка.
Таксама я... Што даць табе магла?
Шчыруе ў днях гарэзлівых каханка,
а я табе каханаю была.

Няхай мне доля мужнасць выкладае,
жанчыне слёзы дадаюць гадоў...
Стаю на раздарожжы маладая,
а ў маладое — шмат заўжды шляхоў.

Пражытае на дне вачэй хаваю,
жыву з цяпельца даўняга святла...
Забытая! Няхай. Затое знаю,
што я табе каханаю была.

1987

* * *

Бывала, ў ціхае начы
маю пяшчоту разгаворыць,
сам замыкаешча, маўчыць,
нібы канала сэрца ў горы.

Захуталася ў лёгкі плашч,
а на сцяжынах іней слаўся,
і мне здавалася, што плач
з губ непакорлівых зрываўся.

Вярталіся ў халодны дом,
там сцены дыхалі спакоем,
але пякучай крыўды ком
пужаў прыгнечаным настроем.

Да тых начэй цяпер прыкута
дасюль нязнаным пачуццём,
ён быў тады маёй пакутай,
ён стаў шчаслівым забыццём.

1987

* * *

Пра рознае, ды на паўгуках —
спакойна,
          стала,
          без прыкрас,
і сэрцам чуць, як стынуць рукі
ад непазбежнага між нас.

Я не баюся таямніцы,
якая звязвае ўдвая...
Не дай жа потым усумніцца,
што я каханая твая.

Невыпадковаю гадзінай,
калі сам д'ябал нам радня...
Узведзенай у ранг адзінай
хачу запальваць неба дня.

1987

* * *

Не адцвітала доўга бульба ў полі,
хоць на спякоту шчодрым жнівень
          быў,
ты абяцаў не забываць ніколі
спатканняў нашых,
          дык чаму ж забыў?

Парушу сон палянкі недалёкай,
і заваражыць пошапак ляшчын,
сябе я адчувала б адзінокай,
каб не было ні дрэў, ні аблачын...

Не хоча сэрца прымірыцца з жалем,
ды ўсё гусцей паўзмрок сырога дня,
нібыта ўчора на лясным прагале
згубіла казку лета ласяня...

1987

* * *

Гэтай начы неспакойиае назва —
спрэчка разгневаных дзвюх навальніц,
тайны жанчыны другой — не расказвай,
цесна ў душы ад сваіх таямніц.

Грымнула громам густым з бліскавіцай
хмара адчаем падстрэленых фраз,
дзіўны, ці ж трэба душы таямніца
тая, што лішняю будзе якраз.

1987

* * *

О, я не ў сон глухі закута,
сумота сэрца не скрабе,
было турмою і атрутай
усё, дзе не было цябе.

Апошні снег...
Ён, як збавенне
ад спраў, што марнымі былі.
Ты мне вярнуў ізноў натхненне,
бязмежнасць неба і зямлі.

Як многа стала летуценняў,
бы ўночы зорак залатых,
І, як чароўны міг цвіцення,
мне сінява вачэй тваіх.

Капрыз свавольнае прыроды
ці дня настылага адчай? —
Чуць не хачу, з якой нагоды
гукнуў ледзь чутна: «Прывячай...»

Ёсць тлум жыццёвай крутаверці,
ёсць ачышчальнае святло,
і не закрэсліць нават смерці
таго, што радасцю было.

Так хораша ўсяму здзіўляцца,

бы рэчка ў пустку зацякла,
а пацеркі ў халодных пальцах
усё дрыжаць, нібы са шкла...

1987

* * *

Як часта ў свеце, бы ў бязладнай хаце,
перад якого госцяю стаю,
бяссрэбранік гаворыць пра багацце,
а хцівы пра нішчымніцу сваю.

Пакрыўджаны глыбей хавае слёзы,
бяздушны — непрыяззі пачуццё...
Няма фальшывых, што жывуць без
позы...
ёсць свет
і розны погляд на жыццё.

1987

* * *

Адорыць глеба рупны клопат злакам,
чаканых верне мараю шаша,
дзе лёс вучыў пакутаваць і плакаць,
смяяцца навучылася душа.

А чэрвень па цяпле прайшоўся градам,
а жнівень спапяліў пяшчоту траў,
як можна зараз захапляцца садам,
што завязі ніводнае не даў?

Ды ёсць жа, ёсць жа ісціна на свеце:
ва ўласнай долі — кожны садавод,
я на слязе ізноў гадую квецень,
пакутую: ці дасць жаданы плод?!

1987

ДОЛЯ

Не шкадавала ціхага святла,
якім цвіце палеская каліна,
зыначыла дарогу да сяла,
дзе ботамі мясілі бабы гліну.

Запомніўся ламачча зябкі хруст,
калі мой дзед унукам для ўспаміну
садзіў ля той дарогі кволы куст
загадкавага пахкага язміну.

Цяпер той куст здаецца дварняком,
што некалі ляцеў усім над ногі,
ён за любым бяжыць таварняком,
бяжыць... і застаецца ля дарогі.

1987

* * *

Вясёлка пёркамі паўліна
над лёгкім марывам гарыць...
У яр страсае цвет каліна,
і, мне здаецца, без пары.

Прыроды веснавой выдвары
ці адцвітанню самы час,—
перад яе самотным тварам
яшчэ зажурымся не раз.

Рванецца птушка, як з палону,
увысь, і зноў замруць кусты,
і голас мой ляціць з адхону:
«У ласкавым дні пабудзь хоць ты!»

Ты — справядлівы, мудры, дужы,
хто і апраўдваў, і караў...
Вучыў: хай знаюць роднасць душы,
а сэрца сэрцу не аддаў!

1987

ВЕРА

Прычароўваў словам і пяшчотай,
з творчае выкрадваў цішыні,
а пасля назваў усё дурнотай
і застаўся ў прамінулым дні.

Дзён шчаслівых многа тоіць будзень
цешыў сэрца просценькі матыў...
Ах, яно ізноўку верыць: будзе
гэткі дзень,
забыўшыся, што быў.

1987

* * *

Ты, магчыма, словы пераблытаў
і сказаў балючыя таму,
што спатканне першае забыта,—
прывіталі снегіры зіму.

На двары даўно пахаладнела,
можа, табе ў сэрца удыхнуў
яры снежань свіст кудасы белай,
каб ты ціхай ласкі не пачуў.

Наша лета доўга адцвітала,
аж пакуль зусім не адцвіло...
Снег ляжыць на вуліцах квартала,
сыдзе ён, і... вернецца цяпло.

У душы народзіцца здзіўленне,
ну няўжо — адлёгся снегапад?..
Дай пабыць тваім крылатым ценем,
словы тыя забяры назад.

1987

* * *

Выбліснуў дзень — як прыроды
адвольнасць,
з яснага неба на пашу зялёную гром...
Упершыню адчуваю бяздомнасць,
маючы светлы памерамі дом.

Трэба куточак маленькі — не пута,
з радасцю трэба, дзе ў лішніх трывога...
Зараз сустрэць бы таго баламута,
што даць мог усё,
ды не даў мне нічога.

1987

КУЛЁМА

Была вятрам бязлітасным знаёмай.
Ніхто не ведаў — хто яна? Адкуль?
Ішла сялом, шапталі ўслед: «Кулёма!
Не дзеўка, а саломы мокрай куль».

На тое й слова —
ўсцешыць і параніць,
калі ж клявалі зябліва гракі,
у сажалцы знайшлі яе пад ранне
скупыя на размовы рыбакі...

Хавалі,— сонца выбліснула ясна
ка дрэвы, на зрудзелую траву,
і нехта з цётак у далоні пляснуў:
«Ба-а, людцы, як жа, бедную, завуць?»

З часоў тых, кажуць,
ля жытоў нязясатых,
дзе дзікае шалее васаўё,
Кулёма супыняе нежанатых,
пытаецца: «Дзе прозвішча маё?»

1987

* * *

Кароткіх сустрэч на прыпынку не будзе
і доўгіх размоў пры святле ліхтара...
Ад жалю ўратуюць сардэчныя людзі,
ад плёткі — ўсёбачнае вока двара.

Над светам глыбока ўздыхне завіруха,
і ў белай, бы з цвету каліны, начы
заплача няшчасны — пякельная скруха,
шчаслівы падумае — песня гучыць.

Да кофты дзіцячай прыладжваю
брыжык,
вучуся ў разважлівай строгасці жыць...
А кот Бургамістр, бесталковы і рыжы,
самлелаю вартай на сходах ляжыць.

1987

* * *

У дваццаць нуль-нуль на развілцы...
І крокі я чую здалёк.
Заблытаўся ў сонечнай грыўцы
пакутнай вясны матылёк.

Ён верны сямейнаму дому,
ён ходзіць з дачкою ў музей,
але не раскажа нікому
пра ўздых, што ірвецца з грудзей.

Пра мой сарафан адмысловы,
пра сціпленькі белы букет,
пра самыя тайныя словы,
з якіх пачынаецца свет.

1987

НАПРАДВЕСНІ

А дожджык быў гарэза-бутафор,
кап-кап,—
ледзь пырснуў і пабег наўцёкі,
і толькі капяжы (вясёлы хор)
мелодыяй плывуць па вадасцёку...
Прылёг прамень хітрушчы на грудок
і, знай сабе, свідруе халадэчу,—
сумуе снег, разрумзаўся лядок,
а павадак зайграў накцюрн сустрэчы...
Відно, згадала бульба баразну,
бо з поўнага каша — кувыль —
пад дзверы...
Што ж, паважаю добрыя намеры
і гавару: «Іду гукаць вясну…»

1987

* * *

Калі ў лясах зялёных птах пяе
у час начны, халодны і трывожны,
я знаю, ты прыходзіш ад Яе
і зноў са мною сумны, як астрожнік.

На ноч расстанне наша адцягну,
калі ж з усходу сонца адзавецца,
ты пасміхнешся зманліва акну,
бы Той, што прымушае біцца сэрца.

О гэта усмешка — горычы ганец,
напэўна, вельмі доўга я кахала,
што нават часу ўспомніць не ставала —
усё на свеце мае свой канец...

1987

* * *

Ледзь толькі промень жвавы глянуў
па дах гасцініцы іржавы,
мы з'ехалі цішном з Варшавы
ў адчайна бэзавы Вілянуў.

І повязь гронак тых павіслых
духмянай сыпала парошай,
нас прывячала ціха Вісла
санлівым шэптам: «Bardzo proszę».

Такім агнём палілі промні,
так бэз шумеў раскалыханы,
што весела было не помніць
таго, хто быў маім каханым.

Збягалі з юнага пагорка,—
цішэлі словы нечакана,
але пра што была гаворка,
дазвольце ведаць мне ды пану.

Ужо гады нашы прывялі,
а ў пору бэзавай парошы
працяглым рэхам «Bardzo proszę»
камусьці адгукнуцца хвалі...

1987

ЗАЗІМАК

Ну як табе пад інеем, вяргіня,
ты нібы радасць позняга кахання,
а вось жа кажа: святамі пакіне,
бы абяцае раніцы змярканне.

Ды ўжо было: не раз мяне кідалі,
прывязваючы да надзеі горкай,
адны, што караблі, з вачэй зніҡалі,
другія — нібы мышы ў сваіх норках...

Як заўтра быць?
            Не трапячы, вяргіня,
яшчэ растопіць іней твой заранка...
Падумаць толькі — святамі пакіне!
Стаіць жа вунь і без бусла буслянка.

1987

* * *

Мільёны дзён мяне кахаў,
мільёны дзён ішоў з нябыту,
з'явіўся ўрэшце і сказаў:

«Як дзіўна, мною ты забыта».
Пачнуць на горцы наракаць
на ўрокі юныя мінчане,
што ж, я змагла б ім выкладаць
прадмет пад назваю «Маўчанне».

Маўчу... Ні клопату, ні спраў,
прайшоў праз сэрца, выйдзе ў дзверы
той, хто мільёны дзён кахаў
і... ў гэта сам не змог паверыць.

1987

ДЗВЕ ГАДЗІНЫ НАВАГОДНЯЙ НОЧЫ

Не д'яблік з чараўнічай табакеркі,
а вечар шчодры ўсім раздаў дары...
Дзяўчынкам — лялькі,
хлопчыкам — цукеркі,
а мне — твая пяшчота да зары.

Сукенак жар, усмешкі, як пагоня...
Сярод знаёмых твараў ты адзін,
хто расказаў маёй душы сягоння
ўсю радасць святу дадзеных гадзін.

Магу смяяцца, лёгенька кружыцца
над позіркам, што ўзнёс мяне да зор...
Ці поўні бляск, ці цацка заіскрыцца,
ў паглядзе — пал,
адчайнасць
і дакор...

«Люблю цябе...» — выводжу па
сурвэтках,
люблю цяпер... Хацелася б — заўжды.
І твар хаваю ў папяровых кветках,
і чую пах духмянай рэзеды.

1987

* * *

Не кожны мае ўладу, як халіф,
не кожны грошы гэтаксама мае,
ды кожны носіць пры сабе свой міф,
спярша стварае, потым разбурае.

Вось ты... яшчэ прыходзіш гаманлівы,
і словы часта кружаць галаву,
а ўжо не помню дзён сваіх шчаслівых,
у прадчуванні шчасця зноў жыву.

1987

ЗА ДЗЕНЬ ДА СНЕЖНЯ

Ужо на тры замкі закрыўся жмінда
і недзе перад ложкам ловіць моль,
а па садах згалелых ходзіць крыўда,
я чую — дрэвы скардзяцца на золь.

Слата, слата… а ў позірку чаканне,
бы феерверкам выбухне зіма…
Прымроіцца, як ясны дзень, каханне,
цьфу на яго! Яно заўжды чума.

Гартае свет турбот будзённых кнігу,
нямала ў ёй старонак для мяне,
і круціць лёс, нібы разводдзе крыгу,
не сплю…. Чакаю сонейка ў акне.

1987

* * *

Зачэпіцца сонца за снежную горку,
і хлыне ў даліну патокам вада…
Забуду апошнюю нашу гаворку,
а ўсё-такі… нечага трошкі шкада.

Ніколі не выспее яблык дачасна,
за радасцю часта прыходзіць нуда,
сказаць не магу, каб была я няшчаснай,
ды ўсё-такі… нечага трошкі шкада.

Бывае, заўважу ў аконным праёме,
пытаюцца, хто ты,— такая бяда! —
спакойна адказваю — проста знаёмы,
і ўсё-такі…— нечага трошкі шкада.

1987

ШЫПШЫНА ПРЫ ДАЛІНЕ

І ўсё ж я не сказала: «Прэч!»,
хоць знала, што душой астынеш...
Дарма ў знак будучых сустрэч
садзіў шыпшыну пры даліне.

Не мне душу тваю караць,
будзь ласкавейшым з той,
што зараз
яшчэ не ўмее раўнаваць,
яна — твой суд і твая кара...

А мне разлука студзіць скронь —
не захліпнуцца б ва ўспаміне...
І палымнее, як агонь,
цвіце шыпшына пры даліне.

1987

БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Раіса Андрэеўна Баравікова нарадзілася 11 мая 1947 года ў вёсцы Пешкі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачага.

У 1965 годзе скончыла Бярозаўокую школу і пачала працаваць літсупрацоўнікам у быхаўскай раённай газеце «Маяк Прыдняпроўя». У 1966-1971 гг. вучылася ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага ў Маскве. Пасля заканчэння працавала рэдактарам на кінастудыі «Беларусьфільм» (1971-1972), карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва» (1972—1977). Некалькі гадоў кансультавала пачаткоўцаў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». Цяпер займаецца творчай працай.

Першыя вершы надрукавала ў 1960 годзе. Выдала зборнікі лірыкі «Рамонкавы бераг» (1974), «Слухаю сэрца» (1978), «Такое кароткае лета» (1981), «Адгукнуся голасам жалейкі» (1984), «Каханне» (1987),— за апошнюю кнігу прысуджана Літаратурная прэмія імя Аркадзя Куляшова.

Раіса Баравікова працуе і ў жанры прозы. Яе пяру належаць аповесць «Кватарантка» (1980) і кніга для дзяцей «Галенчыны «Я», альбо Планета Цікаўных хлопчыкаў» (1989).

Перакладаюцца вершы паэтэсы і на іншыя мовы. У 1982 годзе ў Маскве ў выдавецтве «Советский писатель» была выдадзена кніга лірыкі «Горицвет».

Шмат працуе Раіса Баравікова і ў галіне мастацкага перакладу.

ЗМЕСТ

Баравікова Р.

Пад небам першага спаткання. Лірыка,— Мн.: Маст, літ., 1990,— 174 с.: іл,— (Б-ка беларус. паэзіі).

ISBN 5-340-00623-9.

Боровикова Р. Под небом первого свидания: Лирика.

Раіса Баравікова — адна з самых яркіх прадстаўніц паэзіі яе пакалення. Нястрымная страснасць яе ранніх інтымных вершаў у апошні час спалучаецца з унутранай стрыманасцю, не губляе пры гэтым сілы пачуццяў і глыбіні разумення жыцця.

У кнізе сабрана лепшае з творчага багажу паэтэсы. лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова.

4702120202—008
Б М 302(03)—90 123—90

ББК 84Бел7

Литературио-худошественное издание

БОРОВИКОВА Раиса Андреевна.
Под небом первого свидания. Лирика.
Минск, издательство «Мастацкая літаратура».
На белорусском языке.
Літаратурна-мастацкае выданне
БАРАВІКОВА Раіса Андрэеўна. Пад небам першага спаткання. Лірыка.
Рэдактар В. М. Хлебавец. Франтыспіс М. А. Веціка. Афармленне В. С. Юрчанкі. Мастацкі рэдактар Л. Я. Прагін. Тэхнічны рэдактар М. Ц. Папкова. Карэктар Н. У. Доваль.
ІБ № 3416
Здадзена ў набор 02.06.89. Падп. да друку 27.10.89. Фармат 60X90 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 5,50. Ум. фарб.-адб. 6,63. Ул.-выд. арк. 4,06. Тыраж 3700 экз. Зак. 2599. Цана 70 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура»
Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.